


Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ

Наша слова



Газета выходзіць з сакавіка 1990 года № 39 (578) 9 КАСТРЫЧНІКА 2002 г.

ДЭКЛАРАЦЫЯ АБ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ І СУВЕРЭНІТЭЦЕ БЕЛАРУСІ

Прынята Малой Радай МГА "Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына" 26.09.2002г..

МГА "Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына" заўсёды стаяла на грунце падтрымкі суверэнітэту і незалежнасці Беларусі. У сувязі з тым, што рэальная пагроза іх страты зноў нарастае, лічым сваім абавязкам заявіць наступнае.

У трэцяе тысячагоддзе Беларусь увайшла як суверэнная дзяржава. Пасля некалькіх стагоддзяў залежнага існавання ў складзе іншых дзяржаў, намаганнямі і барацьбой некалькіх пакаленняў адраджэнцаў, праз ахвяры страты і паразы Беларусь здабыла сваю незалежнасць, атрымала сваю дзяржаўнасць.

Выпрабаванні, аднак, не скончыліся. Глыбокую трывогу выклікае стан беларускай мовы, культуры і гістарычнай спадчыны. Ідуць працэсы разбурэння сістэмы нацыянальнай культуры, адукацыі, навукі, нацыянальных сродкаў масавай інфармацыі. Сістэма беларускага кнігадрукавання пазбаўлена належнай дзяржаўнай падтрымкі.

Кан'юнктурная палітыка кіраўнічых колаў на "единение" з Расіяй, стварэнне беларуска-расійскага "союзного государства" пры адначасовай самаізаляцыі ад заходніх краін, паставіла Беларусь перад дзвюма рэальнымі пагрозамі: ці інкарпарацыі ў склад Расіі, ці ператварэння краіны ў замкнёную дзяржаву, ізаляваную ад ўсяго свету, не толькі ад Захаду, але і ад Усходу.

Але ёсць яшчэ адзін шлях.

Шлях захавання і ўмацавання Беларусі ў якасці нацыянальнай дэмакратычнай дзяржавы нсад'емным пастулатам існавання якой з'яўляецца ідэя беларускага адраджэння - мовы, культуры, нацыянальнай самасвядомасці.

Гэтым шляхам пайшлі, ідуць дзесяткі краін Еўропы і свету, што дасягнулі высокага ўзроўню развіцця і дабрабыту насельніцтва.

Гэты шлях не адмаўляе добрасуседскіх, на ўзаемную карысць, адносін з Расіяй, але як дзвюх самастойных дзяржаў.

МГА "Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына" заяўляе аб сваёй салідарнай пазіцыі з усімі дэмакратычнымі сіламі краіны, ідэалам і мэтай дзейнасці якіх з'яўляецца незалежнасць і суверэнітэт, дэмакратыя і свабода для Беларусі.

ЗБС "Бацькаўшчына" заклікае беларускую дыяспару за мяжой і надалей прыкладаць усе магчымыя намаганні дзеля тлумачэння гэтага ідэалу народам і ўладам краін іх пражывання.

ЗБС "Бацькаўшчына" звяртаецца з асобным заклікам да беларускай дыяспары ў Расіі выкарыстоўваць свае магчымасці для тлумачэння расіянам выгод існавання Беларусі ў якасці незалежнай і дэмакратычнай дзяржавы для самой Расіі, як маста паміж Уходам і Захадам. Намер ператварэння Беларусі ў частку Расійскай Федэрацыі пасварыць нашыя народы, дэстабілізуе палітычную сітуацыю ў Еўропе.

"Дзеяслоў" -- дзейнасць словам, дзейнасць не на словах


Пад час XIV з'езду Саюза пісьменнікаў прайшла прэзентацыя першага нумара новага літаратурнага часопіса "Дзеяслоў".

Паводле выходных звестак трэба разумець, што часопіс не зарэгістраваны ў Рэспубліцы Беларусь, але выдадзены выдавецтвам, якое мае ліцэнзію, надрукаваны часопіс у Літве. Магчыма, гэта не зусім так. З усімі тонкасцямі беларускіх законаў не зможа разабрацца, мабыць, не адзін юрыст. Але часопіс выйшаў і, хочацца спадзявацца, будзе выходзіць.

У часопіса грунтоўны змест: версэты Алеся Разанава, паэма "Паланэз" Уладзіміра Някляева, танка і гекзаметры Ніла Гілевіча "Па чужых узорах", вершы з кнігі "Крэйдавае кола" Яна Чыквіна, верш "Скрыпач Антоні" ЛеанідаДранько-Майсюка, вершы Міхася Скоблы "Закаханы ў неба свабоднае край", вершы Алеся Пісьмянкова "Паэт і рыбніца" і Юліі Гайдукевіч "Маладая", два апавяды з кнігі Святланы Алексіевіч "Чароўны алень вечныхловаў", лірычныя запісы Янкі Брыля "Вясна" і шмат іншага.

Галоўны рэдактар - Барыс Пятровіч (Сачанка), намеснікі Эдуард Акулін і Алесь Пашкевіч - сённяшні старшыня Саюза пісьменнікаў.

Часопіс зроблены на еўрапейскім узроўні (ацэнка Ніла Гілевіча), мае 256 старонак фармату А-4. Часопіс выйшаў без падтрымкі дзяржавы і ў гэтым асноўны яго сэнс, яшчэ большы сэнс ён займее, калі захавае рэгулярнасць выхаду. Па сутнасці



-- гэта адказ беларускага грамадства на захоп дзяржавай літаратурных выданняў Беларусі. Назва часопіса сама нясе гэты сэнс. "Дзеяслоў" -- гэта рэальны практычны пераход ад словаў да справы. Гэта сітуацыя, калі слова ёсць справа, ёсць дзейнасць.

Яраслаў Грынкевіч.

Напярэдадзе месячнік "Спяваем па-беларуску"

Мінуў месячнік "Размаўляем па-беларуску". У сувязі з гэтым Сакратарыят ТБМ канстатуе, што па выніках апытання больш за 30% грамадзянаў Беларусі падтрымалі ініцыятыву ТБМ. Яшчэ 15% нашых прыхільнікаў не размаўляюць на роднай мове толькі таму, што саромеюцца.

ТБМ удзячнае дзяржаўным і недзяржаўным СМІ, беларускім дабрадзеям за інфармацыйную і фінансавую падтрымку акцыі і заклікае ператварыць месячнік у штомесячнік.

Так, мы прапануем у кастрычніку правесці месячнік "Спяваем па-беларуску".

Набывайце беларускую музыку!

Шаноўная беларуская грамада! Слухайце беларускае! Звяртайцеся на радыё і тэлебачанне з прапановамі часцей перадаваць песні на роднай мове. Прапануйце газетам тэксты беларускіх песень разам з нотамі. Зробім беларускую песню папулярнай і вядомай!

Пакуль народ спявае на роднай матчынай мове, Беларусь будзе жыць.

Сакратарыят ТБМ.

3.10.2002.

Знайшлася мемарыяльная дошка Максіму Гарэцкаму

19 верасня 2002 г. у сквер насупраць будынка былога Інбелкульта (вул. Рэвалюцыйная 15), дзе зараз месціцца МГА "Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына" і Нацыянальны навукова-асветны цэнтр імя Ф.Скарыны, была падкінута мемарыяльная дошка Максіму Гарэцкаму (скульптар Мікола Бакуменка). Нагадваем, што дошка была ўстаноўлена ў 1993 г. з нагоды 100-годдзя з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры і была скрадзена з фасаду гэтага будынка няпярэдадні Трэцяга з'езду беларусаў свету ў чэрвені 2001 г. паколькі гэты твор быў зроблены з цэлюміна, то каштоўнасці для ахвотнікаў на каштоўныя металы не складаў. Па факту знікнення дошкі была ўзбуджана крымінальная справа.

Калі МГА "ЗБС "Бацькаўшчына" ўпэўнілася, што пошук дошкі будзе безвыніковы, аб'яднанне звярнулася ў Менгарвыканкам з просьбай аб узнаўленні мемарыяльнай дошкі. Менгарвыканкам даў станоўчы адказ і зараз скульптар Алесь Шатэрнік ушчыльную займаецца гэтай працай.

І вось, больш чым праз год, мемарыяльную дошку класіку беларускай літаратуры знайшлі ў скверыку, пад дрэвамі. Насупраць сядзібы МГА "ЗБС "Бацькаўшчына". Знайшоў яе мастак Леанід Данэлія падчас выгулу свайго сабакі. Са слоў мастака, ён выключае варыянт, што дошка праляжала на гэтым месцы больш за год, таму што кожны дзень выгульвае ў гэтым мясцы свайго сабаку, але гэтую знаходку заўважыў упершыню. Па знешняму выгляду знойдзенай дошкі можна зрабіць выснову, што яна вельмі працяглы час знаходзілася ў зямлі. Але на пытанне, хто яе адкапаў і падкінуў у сквер, адказ хутчэй за ўсё не знойдзецца. Зараз дошка знаходзіцца ў офісе МГА "ЗБС "Бацькаўшчына".

Прэс-цэнтр МГА "ЗБС "Бацькаўшчына".

Віншаванне

Сакратарыят ТБМ віншуе з Днём народзінаў сяброў ТБМ, якія прыйшлі на свет у кастрычніку:

Алену Бобрык
Міхася Булавацкага
Віктара Бялецкага
Анатоля Дзмітрыенку
Васіля Брамаловіча
Дзіяну Кавалевіч
Уладзіміра Каратая
Вячаслава Малько
Уладзіміра Міцкевіча
Іосіфа Навумчыка
Валерыя Палцюка
Івана Спосабава
Алеся Стральцова
Віталя Сухарэвіча
Кастуся Тарасава
Аляксандра Угрына
Ларысу Долбік

Не – рэпрэсіўным законам!

Падтрымліваю зварот Беларускай асацыяцыі журналістаў аб адмене артыкулаў Крымінальнага кодэкса "Паклёп у дачыненні да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь" (арт. 367), "Абраза Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь" (арт. 368) і "Абраза прадстаўніка ўлады" (арт. 369)

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________________
Год нараджэння ____________________
Адрас ____________________
Асабісты подпіс ____________________

Заўвага: *Ваш подпіс можа стаць падставай для заканадаўчай ініцыятывы з мэтай адмены вышэйзгаданых артыкулаў. Запоўнены купон просім накіроўваць у рэдакцыю газеты.*

Да 120-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа

МАГУТНЫ ПРЫРОДНЫ ТАЛЕНТ

Народны паэт Беларусі Якуб Колас у сваім творчым развіцці прайшоў слаўны і пачэсны шлях. Яго творчасць – гэта выдатная старонка ў гісторыі беларускай літаратуры. Творчасць Коласа ілюструе не толькі цэлую эпоху ў культурным жыцці краіны, велізарны пласт нацыянальнага жыцця, а і падымаецца да мастацкага ўсведамлення агульначалавечых глабальных праблем.

Паэт, як ніхто іншы, здолеў пранікнуць у тайнікі народнай душы, угледзець і перадаць прыгажосць роднага краю. Крыніцай Коласавага таленту сталі глыбіныя праявы жыцця беларусаў, наша спрадвечная багатая нацыянальная культура, крупінкі мудрасці чэрпаў ён у багацейшым на славянскіх прасторах беларускім фальклёры.

Магутны прыродны талент, велізарная працавітасць і нястомная прага літаратурнага самаўдасканалення зрабілі Коласа волатам мастацкага слова, вывелі ў першыя шэрагі выдатных дзеячаў славянскай культуры.



Якуб Колас. 1913 г.

Шлях сапраўднага мастака заўсёды няпросты, і лёс творчага сталення Якуба Коласа яркі таму прыклад

Нараджэнне будучага паэта выпала на канец XIX стагоддзя – сацыяльна неадаптаваны час, калі чалавеку з ніжэйшых саслоўных кагортаў шлях у вялікую навуку ці мастацтва быў практычна зачынены. Аднак, насуперак неспрыяльным сацыяльна-палітычным умовам, талент юнака з наднямонскай лесніčоўкі не загінуў.

Колас увайшоў у літаратуру як пісьменнік, які ў сваіх творах увасабляў прывабную для народа, дэмакратычную па сваёй сутнасці ідэю волі. Абраўшы для сябе місіянскую ролю Песняра, паэт панёс людзям "агонь душы і сэрца жар" – шчодры дар свайго таленту.

Коласа па праву лічаць заснавальнікам нацыянальнай прозы, аднак і паэтычныя яго творы – паэмы "Новая зямля", "Сымон-музыка" – па праву належаць да лепшых узораў беларускай паэзіі.

Эпічная паэма "Новая Зямля" стала філасофскім асэнсаваннем цэлай эпохі ў жыцці беларускага народа, пазначанай пакутлівым пошукам шляху нацыянальнага самаўсведамлення. Колас выразна вызначае асноўную ідэю свайго твора як ідэю агульнанацыянальную: быць гаспадаром можна толькі на ўласнай зямлі.

Эстэтызуючы сялянскі побыт, працу на зямлі, багацце ўнутранага свету народа-працаўніка, паэт сваім пафасным словам прымушаў задумацца сваіх сучаснікаў над адвечнымі маральна-этычнымі праблемамі чалавецтва.

Драматычны, і часта трагічны, лёс таленту вымушанага гадавацца ва ўмовах сацыяльна-класавай барацьбы, стаў тэмаю велічнай сімвалічнай ліра-эпічнай паэмы Якуба Коласа " Счмон-музыка". Па вялікім рахунку – гэта твор аб духоўным адраджэнні нацыі, аб асаблівасці нацыянальнага шляху Беларусі, якая воляю лёсу апынулася на перакрыжаванні розных культур, рэлігійных кафесій, геапалітычных імкненняў.

Стрываўшы шквал вульгарызатарскай крытыкі, шэдэўры Коласавай спадчыны па-ранейшаму ўспрымаюцца беларусамі як творы сапраўды народныя і велічна гуманістычныя.

Якуб Колас ніколі не быў толькі чыстым мастаком – актыўную творчую працу паэт спалучаў з падзвіжніцкай асветніцкай дзейнасцю і плённай навуковай працай. З моманту заканчэння Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі ў 1902 годзе і да апошніх дзён свайго жыцця Колас нёс пачэснае званне настаўніка.

І сёння Беларусь шануе свайго таленавітага сына не толькі за тое, што ён стаў духоўным яе празорцам, але і за ўклад паэта-грамадзяніна ў развіццё і станаўленне нацыянальнай педагічнай канцэпцыі. Якуб Колас быў першым аўтарам метадычных распрацовак па выкладанні роднай мовы і літаратуры ў навучальных установах краіны. Яго "Другое чытанне для дзяцей беларусаў" – адзін з першых поўнавартасных падручнікаў па роднай літаратуры для маленькіх дзяцей. Каштоўнасць гэтага выдання для педагагічнай галіны Беларусі велічная, бо ў складанай грамадска-палітычнай сітуацыі на мяжы XIX і XX ст. кнігі падобнага кшталту былі адзінай даступнай для дзяцей крыніцай пазнання роднага краю.

На працягу 35 гадоў (1921-1956) Колас стаяў ля вытокаў і на чале беларускай навукі. Пачынаў працу ў Навукова-тэрміналагічнай камісіі Наркамасветы поруч з найвыдатнейшымі дзеячамі беларускай навукі і культуры.

Як вучоны-лінгвіст Колас займаўся распрацоўкай навуковай тэрміналогіі для розных галін навукі, культуры, літаратуры. І па сённяшні дзень у большасці сваёй дзейнасці набыткамі слоўнікавага складу, распрацаванага Навукова-тэрміналагічнай камісіяй у пачатку 20-х гг.

Шмат сіл аддаў Якуб Колас і працы ў літаратурнай камісіі Інстытута беларускай культуры. Як чалавек прагрэсіўных поглядаў, ён становча ацэньваў і пастаноўку цэлага шэрагу "нелітаратурных" эксперыментаў: геалагічных, геабатанічных, заалагічных.

На думку Я. Коласа, Інбелкульт падрыхтаваў грунтоўную глебу для заснавання Акадэміі навук Беларусі. І на працягу 28 гадоў Колас быў нязменным віцэ-прэзідэнтам яе гуманітарнага сектара. Яго галоўная думка аб развіцці навукі ў Беларусі надзвычай актуальная і сёння: навука не павінна адрываецца ад жыцця, ад надзённых патрэб будаўніцтва рэспублікі, яна павінна накіроўвацца на вывучэнне прыроды, тэхнікі, народнай гаспадаркі, культуры.

Асветніцкая і навуковая праца цесна стасавалася ў Коласа з грамадска-палітычнай дзейнасцю.

Колас застаўся ў гісторыі Беларусі і як мудры, спрактыкаваны палітык, гуманіст-міратворца высокага кшталту, чыя дзейнасць мела водгук на міжнароднай арэне.

У пераліку грамадскіх пасад паэта – член ЦК Кампартыі Беларусі, дэпутат Вярхоўнага Савету СССР і Вярхоўнага Савету БССР некалькіх скліканняў, старшыня Рэспубліканскага камітэту прыхільнікаў міру і Ўсеславянскага камітэту абароны міру і Ўсеславянскага камітэту, сябар праўленняў Саюза пісьменнікаў СССР і БССР.

Народны паэт Беларусі, заслужаны чдзеяч навукі БССР, двойчы лаўрэат Дзяржаўных прэмій – так за шматгадовую творчую і навуковую дзейнасць краіна ацаніла Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча, любімага народам Коласа.

А тое, што творы Коласа не трацяць сваёй папулярнасці і запатрабаваны чытачом сведчыць статыстыка айчыннага друку. Пачынаючы з савецкіх часоў і заканчваючы сённяшнім днём, у рэспубліцы зарэгістравана выданне 233 назваў твораў агульным накладам 6,0 млн. экзампляраў, у тым ліку на беларускай мове – 202 назвы накладм 3,9 млн. экз., толькі за апошнія 5 гадоў выпуск творчай спадчыны паэта на роднай мове быў прадстаўлены мастацкімі творамі, якія выдаваліся 14 разоў агульным накладм 189,7 тыс. экз.

Вершы, паэмы, празаічныя творы Якуба Коласа перакладзены на 41 мову свету. Яны данеслі каларыт беларускай ментальнасці, архетыпы нацыянальных вобразаў да англійска- і французскамоўных жыхароў Зямлі, немцаў, іспанцаў, італьянцаў, сербаў, чэхаў, жыхароў Усходу; яшчэ ў 1950-я гады Колас загучаў на мовах народаў СССР.

Палову XX стагоддзя нястомна працаваў Колас на славу Беларусі, дзеля яе народа. Пасля смерці Песняра засталіся яго ідэі, вобразы, яго светлае імя. Сёння імем Коласа названы паліграфкамбінат, Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр у Віцебску інстытут мовазнаўства НАН РБ, сем бібліятэк, шэсць калгасаў краіны, дванаццаць сярэдніх школ, цеплаход Дунайскага параходства, прыпынак пункт Баранавіцкага аддзялення чыгункі, плошчы і вуліцы ў 63 населеных пунктах усіх абласцей нашай краіны.

Пайшоў Пясняр,
А песня засталася.
Памёр Паэт,
А песня будзе жыць!

С. Грахоўскі,
Г. Зайцава,
музей Якуба Коласа.

Доўгачаканае выданне

Як ведаюць нашы чытачы, напрыканцы мінулага стагоддзя ў Гарадзенскім дзяржуніверсітэце выйшлі дзве кнігі прафесара Паўла Сцяцко, прысвечаныя нармаванню савецкага варыянту беларускай мовы: "Праблемы нормы, культуры мовы" (Гродна: ГрГУ, 1998. – 294 с.) і "Праблемы лексічнага нармавання беларускай мовы" (Гродна, ГрГУ, 1999. – 292 с.). Кнігі прыхільна сустрэла беларуская нацыянальная інтэлігенцыя – пісьменнікі, навукоўцы, настаўнікі і выкладчыкі ВНУ, супрацоўнікі рэдакцыяў і выдавецтваў. У рэспубліканскім перыядычным друку з'явіліся ўхвальныя водкукі (Я. Зэльвіч. Чысцец для мовы (ЛіМ. 10. 04.1998); І. Германовіч. Дзеля нашага нацыянальна-культурнага адраджэння, захаван-ня нас як нацыі (Наша слова. 6.05. і 13.05.1998); М. Даніловіч. З руплівасцю і пашанай да роднага слова (Роднае слова. 1998. № 3); А. Каўрус. Служэнне роднаму слову (Полымя. 1999. № 1); І. Германовіч. Працяг размовы: Дзеля нашага нацыянальнага адраджэння, захаван-ня нас як нацыі (Наша слова. 15.08.1999)).



Высокую ацэнку атрымалі згаданыя кнігі і ў публікацыях з нагоды юбілею аўтара (М. Шаваркін. Карыфей айчыннага мовазнаўства. Звязда. 4.03.2000; М. Скобла. Рыцар вышьможнага слова. ЛіМ. 3.03.2000 ды іншыя). Выдавецкі аддзел універсітэта і аўтар атрымалі шмат замоваў на кнігі. Аднак задаволіць іх не было магчымасці; наклад іх мізэрны: па 200 асобнікаў. Дадатковае выданне, якое б задаволіла попыт чытачоў, ажыццявіць выдавецкаму аддзелу не ўдалося.

І вось сёлета ў канцы жніўня з'явілася выданне, якое сумяшчае змест ранейшых кніжак у адной, пад назвай **"Культура мовы"** (Мінск: Тэхналогія. 2002. – 444с.). Наклад кнігі – 2 тысячы асобнікаў. Кніга мае надта прыгожы выгляд, зроблены на еўрапейскі ўзор.

У анатацыі чытаем: *"...Аўтар дзеліцца сваімі развагамі пра шляхі ўдасканалення беларускага правапісу, аналізуе тыповыя парушэнні сістэмы нашай мовы ў галіне марфалогіі і сінтаксісу, на шматлікіх канкрэтных прыкладах разглядае праблемы яе лексічнага нармавання.*

Будзе карыснаю журналістам, выдаўцам, настаўнікам, студэнтам, усім, хто цікавіцца пытаннямі культуры сучаснай беларускай мовы."

Мовазнаўчы тэрмін **"культура мовы"** выкарыстоўваецца тут з значэннем моўнай нармалізацыі – ачышчэння савецкага варыянту беларускай літаратурнай мовы ад беззадстаўных пазычанняў і калькаванняў (асабліва з былога ўсесаюзнага стандарту – расійскай мовы), ад штучных структураў, неўласцівых беларускай мове.

Народны паэт Беларусі, акадэмік Максім Танк у 1993 годзе, падчас адраджэння нашай культуры і мовы ў сувярэннай краіне, запісаў: *"Зараз наша мова, якая доўгі час была і ў загоне і ў прыгоне, патрабуе грунтоўнай рэстаўрацыі і ачышчэння ад розных непатрэбных запазычанасцяў"* (Полымя. 1997. № 12. С. 69).

У новым, дапрацаваным выданні падаюцца і дадатковыя (паводле ранейшых кнігаў) прыклады выкарыстання нармаваных адзінак у нацыянальным друку. Лексікалагічныя артыкулы размешчаны ў кнізе без уліку іх алфавітнай паслядоўнасці. Пры канцы кнігі змешчаны паказальнік прааналізаваных моўных адзінак.

У артыкулах звычайна на першым месцы стаіць тое слова, якому аддаецца перавага. Калі другі кампанент вызначаецца, як неадпаведны моўнай сістэме, то дублеты спалучаюцца словамі "**а не**" ("Мовазнаўчы – **а не** моваведскі"); калі яны разглядаюцца, як магчымы сінонімы, то аб'ядноўваюцца злучнікам "*і*" або пражнікам ("Мапа і карта", "Спадзеў – надзея").

Матэрыялам для аналізу ў кнізе паслужыла багатая картатэка аўтара (да 100 тысяч моўных адзінак), складзеная з прыкладаў з нацыянальнага перыядычнага друку, манаграфічных даследаванняў, слоўнікаў ды іншых крыніцаў.

Адрэцэнзавалі кнігу знакамітыя навукоўцы: Любоў Антанюк, доктар філалагічных навук, прафесар і Аляксандра Станкевіч, доктар філалагічных навук, прафесар.

Яраслаў Грынкевіч



Роздум пасля падзеі

Ліпеньскі сімпозіюм і ягонае месца ў часе

Пісьменнік Ніл Гілевіч, неяк, слушна зазначыў у адной са сваіх публікацый – у Беларусі ў апошнія два-тры гады, як ніколі раней, шмат навуковых канферэнцый, сімпозіюмаў, круглых сталоў, асабліва на тэму, што тычыць лёсу нацыянальнай мовы і нацыянальнай культуры. Ён і сам прысутнічаў на сімпозіюме, які, з яго ж словамі, "меў ранг міжнароднага і быў даволі маштабны; у ім прынялі ўдзел навукоўцы, культуролагі і пісьменнікі з 20 краін свету". Я толькі шкадую, што сам Н. Гілевіч чамусьці не выступіў на гэтым форуме, а ён жа канстатуе: "Змястоўны і цікавы ў цэлым адбыўся абмен думкамі на вельмі актуальнай, важнай для ўсяго чалавецтва праблеме". Усё гэта так, і мне, удзельніку падзеі, падалося нават, што гэта праблема на сённяшні дзень, як нідзе, актуальная для Беларусі. Без перабольшвання можна сказаць, што гэта пытанне жыцця або смерці для шчырай, пракаветнай суседкі Украіны, і беларускае грамадства, напэўна, пачало ўсведамляць гэта, усведамляць і трывожыцца, і адсюль тыя шматлікія канферэнцыі, дыскусіі за круглымі сталамі і г. д., пра якія трохі здзіўлена піша Гілевіч. Мяркую, што пасля няўдалага палітычнага дыялогу Беларусі з Расіяй гэтых дыскусій павінна б нават дадацца. Але толькі сімпозіюм, які прайшоў 9-10 лі-пеня ў Менску, будзе займаць сярод іх сваё адмысловае месца. Ён стаў уплывовай культурна-палітычнай падзеяй, значэнне якой выйшла далёка за межы Беларусі, і я далёкі ад думкі, што ўсё, што арганізатарамі форуму было запланавана, адбылося ў тыя 2-3 дні і канцы ў ваду. Не, мяркую, што па перапісцы аргкамітэту і шаноўнага каардынатара праекту пісьменніка Васіля Якавенкі, а таксама ягонага паплечніка Адама Мальдзіса з удзельнікамі дыспутаў, гэты сімпозіюм працягваецца, і на грамадскасць сусветнай супольнасці далей будуць аказваць уплыў ягоныя матэрыялы, што рыхтуюцца да друку, ягоныя дакументы.

Арганізацыя і паспяховае правядзенне Саюзам беларускіх пісьменнікаў гэтага рэзананснага міжнароднага форуму засведчылі неабыякавасць беларускай грамадскасці, як да сваіх нацыянальных пытанняў, так і да глабальных працэсаў у сучасным свеце, да ваяўнічага наступу масавай культуры, пашырэння бездухоўнасці і тэрарызму. У прыканцавых "Высновах, пажаданнях, прапановах" Міжнароднага сімпозіюму слушна падкрэсліваецца надзённасць права кожнага народа на выкарыстанне сваёй мовы, зберажэння сваёй этнакультурнай ідэнтычнасці, а прыняцце афіцыйнага двухмоўя ў некаторых унітарных дзяржавах (Ма-кедонія, Беларусь) не адпавядае праву народаў на самавызначэнне і не абапіраецца на дзейныя міжнародныя юрыдычныя дакументы, што прадугледжваюць абарону моў і культур толькі тых народаў да маргінальных меншасцяў, якія не прадстаўлены у ААН.

Важным тэзісам у гэтым дакуменце з'яўляецца выснова ўдзельнікаў сімпозіюму аб тым, што стандартызацыя культур і іх уніфікацыя аж да знішчэння і знікнення ставяць пытанне пра ўзмацненне намаганняў у абароне нацыянальных культур і моў народаў. Гэта праблема павінна быць у цэнтры ўсіх дзяржаўных, прыватных і грамадскіх структур, асабліва ў Беларусі.

Пра несумненны поспех Менскага міжнароднага сімпозіюму гаворыць якраз ухваленне ягонымі ўдзельнікамі прамовы Эрыка Сляпяна, акадэміка з Санкт-Пецярбурга, праводзіць у Менску падобныя сімпозіюмы на тэму культурнай разнастайнасці сістэматычна – раз у два-тры гады. Гэта найвышэйшая ацэнка працы арганізатараў сімпозіюму, якія забяспечылі для сваіх гасцей камфортныя ўмовы ды еўрапейскі ўзровень арганізацыі і вядзення рабочых пасяджэнняў, далі магчымасць выступіць усім хто хацеў, адкрыта і дэмакратычна рыхтаваўся заключны дакумент.

Вынікі Менскага сімпозіюму без сумніву будуць мець шырокі рэзананс багата ў якіх краінах Еўропы і іншых кантынентаў.

Элементарна, гэты сімпозіюм не мог (і не ставіў на мэту) развязаць усе тыя моўныя і культурныя праблемы, што нагрувасціліся на гэты час у беларускай супольнасці, – гэта ўнутраная справа беларускай улады, грамадскіх арганізацый і ўсёй беларускай супольнасці. Задача ставілася іншая: абгаварыць агульную моўна-культурную сітуацыю, якая склалася на нашай планеце падчас глабалізацыі, і вызначыць мэтазгодныя і эфектыўныя спосабы збераджэння і развіцця культурнай разнастайнасці і паратунку зямной цывілізацыі ад наступу тэрарызму, бездухоўнасці масавай культуры. Вынікі форуму, актыўны ўдзел у ім беларусаў яскрава засведчылі, што гэта мэта ў цэлым была дасягнута.

Вось чаму нам дзіўна было чытаць у беларускім перыядычным друку артыкулы асобных беларускіх пісьменнікаў ды навукоўцаў, якія, пэўна, з прычыны сваёй амбітнасці даволі скептычна ацанілі вынікі працы гэтага міжнароднага сімпозіюму і самі ці то занялі пазіцыю старонніх назіральнікаў, "спасцерагачоў", ці не ўзялі ў ім удзелу наогул і не выкарысталі выдатнай нагоды выкласці там сваё бачанне праблем, унесці канкрэтныя прапановы дзеля далейшых плённых крокаў у паляпшэнні становішча беларускай мовы і культуры.

Адно самі плачы, песімізм, зняверанасць, скаргі, дакоры, папрокі, нараканні, абурэнні і агульная крытыка, як вядома, нідзе і ніколі не давалі плённых вынікаў і не могуць замяніць канкрэтнай штотдзённай руплівай мэтанакіраванай працы, якой займаецца да прыкладу ТБМ. Для поспеху такой працы патрэбна еднасць супольніцтва, грамадская згода, узаемная падтрымка і ўзаемадапамога.

На цяперашнім гістарычным этапе не толькі ў Беларусі, але і ў Украіне, Малдове, Македоніі, Эстоніі і іншых дзяржавах, дзе склалася напружаная моўная сітуацыя, перад усімі прагрэсіўнымі сіламі супольнасці паўстае вельмі актуальная задача настойліва і паслядоўна растлумачыць шырокай грамадскасці відавочную для навукоўцаў сапраўду, што ва ўнітарных дзяржавах афіцыйнае альбо дзяржаўнае двухмоўе (шматмоўе) не толькі не мэтазгодна, але і не дапусціма, бо яно немінуча і няўхільна вядзе да дыскрымінацыі і выцяснення з вядучых сфер супольнасці функцыянавання мовы тытульнай нацыі. Спасылкі ў гэтым выпадку на "міжнародны досвед" (Швейцарыя, Канада, Бельгія, Швецыя), дзе існуюць дзве альбо некалькі дзяржаўных моў, некарэктныя і непрыймальныя. Апроч таго, у Беларусі (як і ва Украіне, Эстоніі) расійскамоўнае і нерасійскамоўнае насельніцтва тэрытарыяльна выразна не размежавана, у адрозненне ад Швейцарыі, якая адразу фармавалася як канфедэрацыя з выразна размежаванымі нямецка-, італьянска-, французскамоўнымі кантонамі ды рэгіёнамі з рэтраманскім насельніцтвам. Па тых самых прычынах, хоць і з некаторымі нюансамі, нам не падыходзіць і досвед іншых краін. Да таго ж, хіба ў еўрапейскіх краінах з дзяржаўным двухмоўем і трохмоўем ні адна з гэтых моў у гістарычнай перспектыве не мела статусу дамінантнай або паднявольнай і не патрабавала дзяржаўнай абароны, як беларуская ды ўкраінская мовы – ад татальнай русіфікацыі, што надзвычай наспела для Беларусі цяпер.

Мы павінны ўважаць на сваё ўнутраныя ўмовы, абставіны і вырашаць наспелыя праблемы па-свойму. Задачу ўсіх нацыянальных творчых суполак, нацыянальна свядомай інтэлігенцыі мы бачым у тым, каб у найбліжэйшай будучыні агульнымі высілкамі пераламаць нядбайна створаную моўную свядомасць супольнасці ("Какая разница. на каком языке общаться?") і выхаваць у ёй унутраную патрэбу ў родным слове не толькі ў побыце, але і ў найвышэйшых духоўных сферах. Канструктыўная пазіцыя і слушныя прапановы на гэты конт, на наш погляд, выкладзены ў артыкуле кіраўніка грамадскага аб'яднання "Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны" А. Трусава ("Народная воля", 09.08.2002). На сучасным этапе і ва Украіне і ў Беларусі патрэбны новыя законы пра мовы, глыбокія і ўсеахопныя сацыялагічныя даследаванні моўных праблем, на аснове якіх варта рыхтаваць новыя канцэпцыі нацыянальнай моўнай палітыкі для ўладных структур і дамаганне іх заканадаўчага ўвасаблення. Але рабіць гэта трэба ўсім патрыятычным фронтам, не разлічваючы толькі на дзяржаву, гісторыкаў, прыяце-ляў за мяжой.

Поспех гэтай працы – у арганізаванасці, злагодзе і памяркоўнасці, а не ў звадках, узаемных абвінавачваннях і пошуку ворагаў.

Рыгор Піўтарак, член-карэспандэнт НАН Украіны, доктар філалагічных навук, прафесар, прэзідэнт Украінскай асацыяцыі беларусістаў.

У Віцебску разгледжаны пытанні выкарыстання беларускай мовы

29 верасня 2002 года адбылося пашыранае пасяджэнне Віцебскай абласной рады ГА "ТБМ імя Ф. Скарыны". Рада абмеркавала ход выканання праграмы дадатковых мер па пашырэнні выкарыстання беларускай мовы ў сістэме адукацыі вобласці. Было адзначана, што ў гэтым навучальным годзе з 760 агульнаадукацыйных школ на беларускай мове працуюць 480, з дзвюма мовамі – 48. Але ўсе гэтыя школы, за выключэннем СШ № 3 г. Грыбокае, вясковыя. У такіх раёнах, як Глыбоцкі, Докшыцкі, Міёрскі, Ушацкі, Шаркаўшчынскі, Расонскі кантынгент вучняў, якія навучаюцца на беларускай мове, складае ад 38 до 71%. Ні аднаго вучня не навучаецца на беларускай мове ў г. Оршы, а ў Полацку – 665, Наваполацку – 269, Віцебску – 950 вучняў. Менш 30% ад агульнай колькасці вучняў вучацца па-беларуску ў Чашніцкім, Сенненскім, Віцебскім, Браслаўскім раёнах.

Абласное ўпраўленне адукацыі трымае на кантролі гэтае пытанне і ў лістападзе 2002 года будзе аналізаваць выкананне праграмы дадатковых мер па пашырэнні сферы выкарыстання беларускай мовы ў сістэме адукацыі.

Віцебская абласная рада ГА "ТБМ імя Ф. Скарыны" накіравала заўвагі і прапановы, выказаныя ўдзельнікамі пасяджэння, у адрас абласнога ўпраўлення адукацыі.

Рада абмеркавала таксама, такую важную праблему, як беларуская мова ў перыядычным друку, на радыё і тэлебачанні вобласці. Было адзначана, што наклад мясцовага друку значна большы, чым колькасць рэспубліканскіх газет, якія распаўсюджваюцца ў вобласці. І складае ён амаль 190 тыс. экзэмпляраў. Таму вялікае значэнне ў дадзенай моўнай сітуацыі мае тое, на якой мове друкуюцца перыядычныя выданні вобласці, вядуцца мясцовыя тэле- і радыёперадачы. Большасць раённых газет, у прыватнасці "Герой працы" (Шуміліна), "Родныя вытокі" (Докшыцы), "Браслаўская звязда", "Наш край" (Паставы), "Міёрскія навіны", "Кліч Радзімы" (Шаркаўшчына), "Голас Расоншчыны" цалкам выдаюцца на беларускай мове. 90 –95% беларускамоўныя газеты – "Лепельскі край", "Дняпроўская праўда" (Дуброўна), "Патрыёт" (Ушачы), "Голас Сенненшчыны", "Полацкі веснік". Аддаюць перавагу беларускай мове аршанская і глыбоцкая газеты. А вось здалі свае пазіцыі выданні "Сцяг перамогі" (Лёзна), "Гарадоцкі веснік", "Жыццё Прыдзвіння" (Віцебская раённая), "Чырвоны прамень" (Чашнікі), "Наша Талачыншчына", "Зара" (Бешанковічы), большасць матэрыялаў у іх рускамоўныя. Амаль не карыстаюцца беларускай мовай газеты "Віцьбічы", "Хімік", "Новая газета" (Наваполацк). Не падаюць прыкладу выкарыстання беларускай мовы абедзве дзяржаўныя абласныя газеты "Віцебскі рабочы" і "Народнае слова".

Абласная рада таварыства выказала падзяку рэдакцыям газет, якія друкуюцца па-беларуску. Рэдактарам выданняў вобласці будуць накіраваны адпаведныя лісты ад імя рады таварыства. Рада разглядзела арганізацыйныя пытанні: памочніка старшыні абласной рады выбраны Анатоль Канапелька, сакратором – Ірына Шарапінская.

У рабоце рады прыняў удзел Старшыня рэспубліканскай рады ГА "ТБМ імя Ф. Скарыны" Алег Трусаў, намеснікі старшыні – Людміла Дзіцэвіч і Алена Анісім. Алена Анісім рэпрэзентавала ўдзельнікам пасяджэння беларускую масава-палітычную газету "Новы час", рэдактарам якой яна з'яўляецца.

Сябра рады Саюза беларускіх пісьменнікаў Сяргей Законнікаў, які быў запрошаны радай для сустрэчы з чытачамі, пазнаёміў з вынікамі XIV, нечарговага, з'езду беларускіх пісьменнікаў.

Старшыня Віцебскай абласной рады ГА "ТБМ імя Ф. Скарыны" І. А. Навумчык.

Выйшаў другі нумар новай газеты ТБМ

Паважаныя сябры!

18 верасня пабачыў свет другі нумар "Новага Часу". Каб у тэрмін яго выдаць, рэдакцыя пазычыла пэўную суму грошай, якія да канца верасня трэба вярнуць.

Для азнаямлення з новай газетай мы разаслалі яе першы нумар ва ўсе буйныя рэгіянальныя структуры ТБМ. Цяпер чакаем ад Вас Вашых водгукаў і дапамогі ў зборы сродкаў на выданне новага нумара газеты.

Узор другога нумара (бо перасылка каштуе немалыя грошы), мы дасылаем толькі кіраўнікам абласных структур ТБМ. Калі нехта з сяброў ТБМ захоча атрымаць другі нумар "Новага Часу", то трэба даслаць нам ліст з дакладным хатнім адрасам (з паштовым індэксам) і пераведці 1000 рублёў (у гэтую суму ўваходзіць кошт газеты, канверта і перасылкі) на наш рахунак, альбо паслаць грошы паштовым пераводам. Жыхары Менска і бліжэйшых ваколіц могуць атрымаць газету ў сядзібе ТБМ (вул. Румянцава, 13) і сядзібе БНФ (вул. Варвашэні, 8).

Паколькі першы нумар разышоўся надзвычай хутка, то наклад другога нумара павялічаны на 500 асобнікаў.

Чакаем Вашых водгукаў.

З павагай Старшыня ТБМ Алег Трусаў.

Новы Час

Казусы Міліцыя, Мін.

Страчаная школа

Скандалы фанаграфіі

БЕСЦЭНЗУРНАЯ ЦЭНЗУРА

Віктар Шалкевіч “Добрай раніцы”, Мн., 2002 БМАqroup

Серыйныя выданні маюць адзін такі вельмі прыватны цымус – прымушаць слухача чакаць наступнага эпізоду серыі. Вось і СД – серыя “Беларускі музычны архіў” спакусіла не аднаго фаната-меламана да сталага пашырэння сваіх музычных зацікаўленняў. Стройная калекцыя разнастайных узораў беларускай музыкі (выканаўчае майстэрства опернага тэнара М. Забэйды-Суміцкага, стваральны і арганізатарскі талент кампазітара і дырыжора М. Равенскага, папоўнілася нядаўна дыхтоўным зборам твораў саркастычнага майстра кабырэтнай песеннай сатыры Віктара Шалкевіча. І калі слухач зноў адчуе тут радасць калекцыянера, дык мне, які ад пачатку серыі апынуўся ў шэрагах яе стваральнікаў, дыск прынёс глыбокія расчараванні.

Не, Божы дар Віктара Шалкевіча зусім не збяднеў, а нават узбагаціўся, але выдавецкая традыцыя, у якой даводзіцца працаваць, зноў наганяе суцэльны сум. Зноў і зноў пераконваюся, што маюць рацыю тыя, хто аспрэчвае пэўнасць аўтарства нават поўнага збору твораў Я. Купалы. бо адны пішуць, не маючы ніякіх правоў а другія друкуюць, дазваляючы сабе самыя адвольныя змены тэксту. І гэта ўжо датычыць не толькі савецкай таталітарнай сістэмы, а нават сучасных вольных выдаўцоў.

Я не стаў кранаць у друку пэўныя пластычныя аперацыі майго ўступнага артыкула да СД М. Забэйды -Суміцкага, але ўступ да збору твораў В. Шалкевіча “дэмакратычныя” выдаўцы так выскапілі, што нельга змаўчаць. Хаця б дзеля таго, каб сказаць слухачу, што В. Мартыненка ніколі б не паставіў свой подпіс пад тым гарбылём, у які пераварылі ягоныя тэксты рэдактар выдання В. Арэшка і кампанія.

Калі ў вас складзецца ўражанне, што Мартыненка не ведае, як назваць беларускі горад Гародня ці Горадня, дык я, як і Шалкевіч, спадкаемцы караткевічаўскай традыцыі, і якога нават “Хрыстос прызямліўся ў Гародні”. Менавіта таму і песня мае назву “У Гародні дождж”. Ну а спадар Арэшка, не могучы перапісаць песню, займаецца экзекуцыяй там, дзе сам гаспадар. Цікава: дзе вакол згаданай назвы ўзнікаюць спрэчкі, а аргументаў не хапае, В. Арэшка лёгка згаджаецца нават на саветызаваную назву Гродна Адсюль і розначытанні ў нібыта “маім” тэкце. Ну а як радыёстанцыя “Свабода” стала нейкай міфічнай “Радыё Свабоды” – таксама запытайце звышпільную карэктуру, якая толькі памылкі ўстаўляе “за сціплую плату”.

Зрэшты, гэта яшчэ дробязі. Усе мы памыляемся. Больш крыўдна для аўтара і незразумела для чытача напорвацца ў тэксце на нейкія, не падмацаваныя ніякімі аргументамі сентэнцыі, напрыклад: “Такі ўжо грэх – надта прадбачлівыя песні стварае бард”. Але ў чым грэх і што за песні? Ды выкраслілі “дэмакраты” выдавецкага профілю цэлы абзац пра гісторыю песні “Таварыш Сапега”, пра пэўныя лёсавызначальныя перыпетыі з прарочымі вобразамі “Кааператыва “Сучка, унучка і палучка”, дзе таленавіты юны вершаплёт, “сын п’яніцаў вясковых, навучаны аж на вершах самога Дударава” параўноўваецца з бацькам нацыі, які, хоць тое і смешна, вучыцца на “вершах самога Быкава”.

Дык вось, яшчэ перад “несмяротным” прызнаннем бацькі нацыі наконт “паэзіі Быкава”, я і загаварыў аб прадбачлівасці песень Шалкевіча, у якіх ужо была “паэзія Дударава”.

Зрэшты, гляньце ў трэк-ліст кампакт-дыска: нешта там няма ніякага “Кааператыва “Сучка, унучка і палучка”. Мо і твор сучасныя цэнзары прыбралі? Ды не, яны ж смелыя. Проста далі яму ні да чога не абавязную назву “Bonus track”. І гэта нягледзячы на тое, што там ужо быў адзін “Прамацыйны bonus- track”.

Калі ў цывілізаваных народаў выдаўцы нават назвай твора імкнуцца павысіць рэйтынг прадукта, беларускія выдаўцы ўмеюць толькі яго размазаць. Таму там, дзе ў нармальных - суцэльныя “Ckeatest hits” (найлепшыя гіты), у тутэйшых – татальныя безыменныя “Bonus tracks” (халяўныя дадаткі). А твор, між іншым, зусім не шэры кардынал, а яркі гім. Ці не з гэтай жа кагорты і замена падзагалоўка “Усё лепшае – людзям” на банальны “Выбранае”.

Мне асабіста выдаўцы патлумачылі гэты казус толькі тым, што не змаглі аператыўна звязацца з Шалкевічам, каб спраўдзіць назву. Але ж затое яны звязаліся са мной і ўдакладнілі ўсе подпісы пад здымкамі. Чаму ж тады ўсе яны няправільныя ?

Здымак 1: Горадня, 1993. “А я ж пісаў “Басовішча - 91”. І кожны заўсёднік фестывалю дагледзіць за спіной барда першую крытую сцэну, на месцы якой цярер месяцца бірклубы спонсараў фэсту.

Спадар Арэшка і тут знайшоў чым патлумачыць: “На другім здымку з “Басовішча” Шалкевіч у іншай кашулі”. Нібыта не меў права бард на другую кашулю? Але ж і апошні здымак – гэта не “Басовішча. Польшча. Гарадок”. А “Беларусь, Ворша, 1992” На тым бардаўскім фэсце, у тым самым намёце і жылі я, Шалкевіч і У. Танада Сааўтар здымка).

Відаць, задача была абы нейкія подпісы паставіць, і няважна, што там на самой справе. Дый тэкст... Ну што там Мартыненка піша пра няздольнасць гарадзенскліх журналістаў напісаць добры артыкул пра свайго земляка? Зрэшты, няхай сабе, а вось пра скандальныя антыбеларускія выпады пісакаў кшталту А. Чобата (напачатку 90-х), А. Мялешкі (напачатку новага стагоддзя) чытач ужо не даведаецца ніколі. За яго усё насмерць прачытаў В. Арэшка. Цэнзар? Не, у буклеце ён называе сябе рэдактарам.


Ну баяліся зачапіць свой гной, каб не смярдзеў – гэта яшчэ можна зразумець (хоць этыкет патрабаваў бы паведаміць жывому яшчэ аўтару ці адмовіць яму ў праве на публікацыю, усё адно ж плаціць за працу не збіраліся. Але навошта ж дазволілі павесіць пустаслоўе: “Ён чытаў мае артыкулы, адгукаючыся на іх у песнях”, калі выкраслілі цікавы рэальны эпізод пра страчаны радок “Цярэшчанку зноў не пусцілі ў Канаду” з песні “Смутны беларускі блюз”?

А радок быў менавіта такі, а не той, які слухач пачуе з дыску. Мо я і сапраўды занадта ўвагу ўдзяляў кадэбісцкім зрывам незалежных канцэртаў таленавітай гомельскай бардэсы ў сваім “Нотным аркушы” пачатку 90-х, але тыя публікацыі захаваліся ў газетных падшыўках, а першасны тэкст Шалкевіча на гэты конт у магнітазапісах.

Ну а чым вам Караткевіч не дагадзіў, якога вы, дэмакратычныя выдаўцы “беларускія”, не дазволілі мне назваць геніяльным? Ды ўсе вашыя імёны знікнуць, а геній Караткевіча яшчэ будзе сілкаваць дух пакаленняў. А наконт “таварышаў Сапегаў, якія пнуцца кіраваць” вы скрэслілі: *“...кіраваць Беларуссю, нават не даўшы сабе проста авалодаць ейнай мовай, асэнсаваць ейную культуру.”*

Скажу шчыра: свае артыкулы я часам перачытваю дзесяткі разоў, дзякуючы чаму пры паўторных публікацыях (у кнігах, у Інтэрнеце) яны маюць тэндэнцыю ўдасканальвацца. Дык вось упершыню не змог прымусіць сябе пазнаёміцца з сваім творам нават паўторна.. Не хачу нічога кепскага сказаць пра лэйбл “БМАgronp”, які і так робіць болей, чым можа. Але побач з прозвішчам В. Арэшка маё прозвішча наўрад ці болей з’явіцца, таму... Бывай, серыя “Беларускі музычны архіў”. А неацэнзураны мой тэкст цікаўныя знойдуць у інтэрнэце на форуме “Віктар Шалкевіч” (Сайт WWW.tut.bi).

Вітаўт Мартыненка.



СВЯТА Ў ЗАЛЕССІ

Восень. Канец верасня. Бурштынавае лісце на дрэвах старога парку...

Кожны год у гэты дзень (25 верасня) стары маёнтак роду князёў Агінскіх у Залессі ажывае, прымаючы гасцей з нагоды дня нараджэння вядомага кампазітара і палітычнага дзеяча мінулага Міхаіла Клеафаса агінскага, аўтара славутага паланэза “Развітанне з радзімай”. Палац, альтанка, касцел, парк, сад, возера, млын... Усё амаль такое ж як і у 19 ст. Гэтымі сцежкамі хадзіў Агінскі, менавіта тут ён напісаў многія са сваіх твораў. Агінскі жыў у Залессі ў 1802 – 1822 гг. Дзякуючы яго намаганням, маёнтак быў рэканструяваны і набыў сучасны выгляд.

22.IX.2002
БЭЛЬВЭДЭР у Залесьсі
Прыехалі мы да Міхала
У госьці, у госьці!
Нас навіна сюды пазвала,
Паклікала нас!
да 237-х угодкаў
Міхала Клеафаса Агінскага

Мы жывём ужо ў 21 ст., але... Трэба ведаць, сваю гісторыю, бо без гэтага мы не маем права “людзьмі звацца”, ці не так? І ў халодны восеньскі дзень у Залессі (або Паўночных Афінах – так назвалі Залессе сябры кампазітара) сабраліся тыя, хто памятае пра М. К. Агінскага і пра яго творчасць: настаўнікі і вучні нашай школы, мясцовыя жыхары, госці з многіх куткоў Беларусі, а таксама з-за мяжы (а гэта настаўнікі і вучні Віленскай беларускай гімназіі імя Ф. Скарыны).

Усе сабраліся каля млына, дзе знаходзілася сцэна, на якой выступілі са спевамі ды віншаваннямі дзіцячая студыя “Альтанка” (кіраўнік – С.І. Верамейчык), фолькгурьт “Старая Літва”, госці з Вілейкі ды Вільні.

Падчас свята былі наладжаны мастацкія выставы “Мае Паўночныя Афіны” Людмілы Рогач (вучаніцы 11 кл. нашай школы), “Агінскі і яго род” і выстава дзіцячых малюнкаў гуртку “Апалонік”.

У гэты дзень у маёнтку было шумна ды весела: чуліся гукі музыкі, спеваў, па сцежках старога парку шпацыравалі людзі... Бынцам на некаторы час вярнулася дзевятнаццатае стагоддзе, калі ў Залессе з’язджалася шмат гасцей у старасвецкіх экіпажах... Праз некаторы час тут стане ціха і крыху сумна, але не назаусёды, а толькі да наступнага 25 верасня ці да чарговай экскурсіі, якія часта праводзяць супрацоўнікі музея.

Прыязджайце у Залессе: стары маёнтак будзе чакаць вас! Асабліва прыгожы ён у час залатой восені...

Дар’я Ліс.

“Трубі, трубі, турыны рог”

Унітарнае прадпрыемства “Тэхнапрынт” выдала зборнік песень гістарычнай тэматыкі Пётры Русава “Трубі, трубі, турыны рог”. У зборнік увайшло 14 песень. Гэта творы на вершы беларускіх паэтаў Г. Валкавыцкага, У. Пецюкевіча, А. Пісьмянкова, Р. Барадуліна, А. Бразгунова, Я. Купалы, С. Панізьніка, М. Башлакова, а таксама, пакладзеныя на музыку пяць баладаў Яна Чачота з цыклу “Спевы пра даўніх ліцьвінаў” у перакладзе з польскай Кастуся Цвіркі (2) і Станіслава Судніка (3).



Наклад кнігі 300 асобнікаў.

Ужывую песні можна пачуць на імпрэзах, у якіх удзельнічае кампазітар і бард Пятро Русаў.

Яраслаў Грынкевіч.

Рэдактар Станіслаў Суднік

Заснавальнік: ТБМ імя Францішка Скарыны.
Пасведчанне аб рэгістрацыі: № 83 ад 28 чэрвеня 1996 г.
Адрас рэдакцыі: 220005, г. Менск, вул. Румянцава, 13.
Адрас для паштовых адпраўленняў: 231300, г. Ліда-2, п/с 7.
E-mail: ns@lida1.lingvo.grodno.by
http://tbm.org.by/ns/

Рэдакцыйная калегія:
Алена Анісім, Вадзім Болбас, Міхась Булавацкі, Людміла Дзіцэвіч, Ірына Марачкіна, Леакадзія Мілаш, Язэп Палубятка, Алесь Петрашкевіч, Людміла Піскун, Уладзімір Содаль, Станіслаў Суднік, Павел Сцяцко, Алег Трусаў.

Аўтары цалкам адказныя за падбор і дакладнасць прыведзенай інфармацыі

Газета надрукавана ў Лідскай друкарні.
231300, г.Ліда, вул. Ленінская, 23.
Газета падпісана да друку 7. 10. 2002 г.
Наклад 2300 асобнікаў. Замова № 1931.
Падпісны індэкс: 63865.
Кошт падпіскі: 1 мес.- 489 руб., 3 мес.- 1467 руб.
Кошт у розніцу: 120 руб.